

Птушкі і Мы

№ 2 (31) 2017
Часопіс грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны»

6+

www.ptushki.org | www.birdwatch.by

Летом в рамках акции «Спаси орленка — 2017» специалисты отловили и пометили спутниковыми передатчиками восемь белорусских больших подорликов. Благодаря этому впервые в истории отечественной орнитологии мы можем узнать точные места зимовки наших краснокнижных орлов.

Вот из каких стран «шлют» SMS большие подорлики



Беларусь
Польша
Украина
Молдова
Румыния
Сербия
Греция
Турция
Сирия
Иордания
Израиль
Египет
Судан

Следите за перемещениями птиц ежедневно на www.ptushki.org/eagle

Проект «Научно-обоснованная охрана глобально угрожаемого большого подорлика в Беларуси» финансируется Министерством иностранных дел Эстонии.
Выполняется Эстонским университетом наук о жизни, АПБ, EagleClub (Эстония) и НАН Беларуси.
Два передатчика предоставлены Британским орнитологическим трестом (BTO).

А вот до каких стран долетают другие наши мигрирующие птицы*

Франция
Италия
Испания
Греция
Чибис
Полевой жаворонок
Тунис
Израиль
Ливия
Вертлявая камышевка
Нигер
Чад
Сенегал
Нигерия
Камерун
Травник
Луговой лунь
Индия
Шри-Ланка
Зеленая пеночка
Обыкновенная чечевица
Ангола
Замбия
Зимбабве
ЮАР
Кукушка
Соловей
Белый аист

*по данным Белорусского центра кольцевания птиц



Сябры!

Галандзец Арыян Дварсаіс у 2016 годзе паставіў сусветны рэкорд па колькасці ўбачаных за адзін год птушак — 6852 віды. Амерыканка Фібі Снэтсінгер аднойчы ў 50 год, даведаўшыся пра сваю страшную анкалагічную хваробу, пусцілася «ва ўсе цяжкія», аб'ездзіла свет і пабачыла больш за 8300 відаў птушак, стаўшы першым чалавекам, які адолеў такую лічбу. Яна пражыла больш гадоў, чым спадзяваліся дактары, поўнасцю аддаўшыся свайму хобі.

Але ж, вядома, калі ты толькі не замахнуўся на чэмпіёнства, справа не ў колькасці. Справа ў тым, што, раптам адкрыўшы для сябе цудоўны і напоўнены яркімі фарбамі свет птушак, ты ператвараешся ў «фрыка», які паўсюль шукае і, што важна, знаходзіць гэтых неверагодных істот. І здарыцца такое ператварэнне можа ў любым узросце.

Адзін мой добры знаёмы, дарослы чалавек, які займае даволі значную пасаду, сёлета ўпершыню павесіў кармушку на балконе. І цяпер, як толькі ў «рэстаран» завітае хтосьці акрамя сініц і вераб'ёў, радасна шле мне ў вайбер фотаздымкі незвычайных візіцёраў, суправаджаючы іх поўнымі захаплення апісаннямі. У мяне ўжо сабралася добрая калекцыя яго таўстадзюбаў, шчыглоў (пакуль чамусьці толькі маладых, без чырвонай плямы на «твары») і зелянушак.

А калі я абдумвала змест гэтага тэксту, стоячы каля акна сваёй кухні на чацвёртым паверсе жылога дома, і разважала пра птушак, на дрэва са зламанай верхавінай — здаецца, гэта алешына — прыляцела самка сірыйскага дзятла. Я ўзяла бінокль, і мы паглядзелі адна адной у вочы — яе былі якраз на ўзроўні маіх.


Бёрдвотчынг — гэта свята, якое заўсёды з табой. Варыш ты каву, пераступаючы з нагі на нагу каля акна, ці едзеш у цягніку, які палохае чародкі чыжоў на дрэвах, ці, размаўляючы з калегай у офісе, глядзіш міма яе — у неба, дзе ляціць сокал-пустальга...

Гэты нумар мы прысвяцілі асабістаму аспекту назірання за птушкамі і паразважалі, чаму людзі «заражаюцца» бёрдвотчынгам і што за дзіўная сіла вызваляе акіян эндарфінаў падчас «птушкавання».


Больш птушак нам усім, прыгожых і натхняючых!

З павагай — Ірына Філіпкова, адказны рэдактар

Змест:








Праект фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

Выдадзена ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, папулярызацыя здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь» («БЕЛМЕД»), які фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца ПРААН, СААЗ, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў партнёрстве з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Прапанаваная інфармацыя адлюстроўвае пункт погляду аўтараў, які можа не супадаць з афіцыйнай пазіцыяй Праграмы развіцця ААН і Еўрапейскага Саюза.





Вокладка:
МІКАЛАЙ ВАРАБЕЙ
Сіняя сініца

№ 2 (31), 2017
Выходзіць з 1999 г.
Перыядычнасць 2 разы на год
Наклад 800 паас.
Рэгістрацыйны № 727 ад 12.09.2009 г. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Наш адрас:
АПБ, вул. Парніковая, 11, пам. 4,
220114, Мінск, Беларусь
Тэл.: +375 17 369-76-13
Факс: +375 17 265-08-11
e-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org

Для карэспандэнцыі:
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь

Дзейнасць АПБ падтрымліваецца Каралеўскім таварыствам аховы птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі. АПБ з'яўляецца афіцыйным партнёрам BirdLife International у Беларусі







Надрукавана на УП «Палікрафт»

Карина Соловей,
менеджер инициативы «Будь здоров с птицами!»:



Я искренне верю, что волна бердвотчинга однажды захватит нашу страну, ведь более азартное, увлекательное, подвижное и в то же время экодружественное хобби сложно представить. Радует, что такие инициативы, как «Будь здоров с птицами!», дают АПБ возможность заглянуть в города по всей стране и показать на практике, что бердвотчинг — это море удовольствия, движение и здоровье! Долгожданное мобильное приложение — определитель птиц, дистанционный курс по основам бердвотчинга и птицам города, чемпионаты по фотобердингу в Бресте и Гомеле — год здоровья с птицами обещает быть насыщенным!

География инициативы охватывает десять городов Брестской и Гомельской областей. В каждом из них в бесплатных школах бердвотчеров орнитологи и опытные бердеры будут делиться «птичьими» знаниями с местными жителями. Там появятся стенды — определители птиц, а в Бресте — веломаршруты для наблюдений за пернатыми.

Остальные уголки страны тоже не останутся без внимания. Чемпионаты по фотографированию птиц, экскурсии, конкурсы, акции и кампании — приглашаем присоединяться прямо сейчас. Стоит только начать, а уж остановиться, поверьте, не получится!

Вопрос-ответ

Добрый день, уважаемая АПБ!

Обращается к вам уроженка Полоцка. Хотя я уже давно не живу в своем родном городе, часто бываю дома у родителей. Наболело на душе за родной край. В деревне Катушенки (район городского поселка Ветрино) осенью 2017 года повсеместно стали сносить гнезда белых аистов. Почему? Лишь потому, что за последние 50 лет, как себя помню, огромные гнезда были построены птицами на водонапорных башнях! В этом году администрация водоканала решила снести башни как ненужные. А как же быть тем аистам, которые прилетят в следующем году в Витебскую область — в поселок Нача, деревню Катушенки?

С уважением — Татьяна Луцевич

АПБ: Башни ликвидируют, потому что они находятся в аварийном состоянии и могут упасть на человека. Это хорошо, что дождались, пока птицы улетят. В идеале нужно построить альтернативные гнездовья, хотя аисты и сами могут построить новое гнездо при наличии подходящей опоры. Местным жителям стоит официально обратиться в Водоканал, Белэнерго и инспекцию Минприроды с просьбой найти возможность сделать аналогичное количество гнезд вместо уничтоженных.



Наталья Селецкая:
3 «В» класс СШ № 1 г. Минска все перемены посвятил птицам города!





Алёна Сарока:
Пасля некалькіх экскурсій па бёрдвотчынгу здарыўся са мной пабочны эфект: людзей не бачу, толькі і выглядваю, дзе якая птушачка трапечацца. Так і хаджу: то галаву задраўшы, то прыглядаючыся да кустоў ды дрэваў, то прыслухоўваючыся да птушыных галасоў. Пакуль была ў бацькоў на невялікім адпачынку, прачыналася пад клёкат буслоў (сёлета іх было надзвычай шмат), па ластаўках надвор'е вызначала і назірала, як небагаты сёлетні ўраджай вішні «збіралі» з дзікім крыкам сойкі. А яшчэ атрымалася сфатаграфаваць зелянушак і канаплянку (яшчэ пару месяцаў таму і не ведала, што гэта за птушачкі, па вызначальніках знаходзіла і ўдакладняла пазней у знаўцаў). Людзі, гэта нейкі асаблівы кайф — назіраць за птушкамі!



Экскурсия по наблюдению за птицами
ЭЛЬВИРА КОРОЛЕВА

Барри Купер:

«Трудно любить природу, когда ее не видишь»

Иностранные бердвотчеры давно обратили внимание на Беларусь как на одно из самых интересных европейских направлений для наблюдения за дикой природой. Кто-то приезжает, ставит «галочки» в списке долгожданных «лайферов» и отправляется за новыми видами в другие страны, а некоторых наша природа очаровывает так, что они возвращаются сюда снова и снова. Британский гид по экотуризму Барри Купер, в прошлом эксперт таких авторитетных природоохранных организаций, как Королевское общество защиты птиц и BirdLife International, бывает у нас практически каждый год начиная с 2005-го. Чем привлекает натуралиста наша страна, за что он любит Минск и когда наше бердвотчерское движение достигнет европейских масштабов? Об этом Барри рассказал в интервью «ПіМ».

ИРИНА ФИЛИПКОВА

«ПіМ»: **Барри, что связывает вас с Беларусью на протяжении стольких лет?**

Б. К.: Впервые я приехал в вашу страну в качестве консультанта и тренера для сотрудников АПБ по просветительской работе. Мой «след» в Беларуси достаточно разноплановый. Например, некоторые учебные материалы, которые я написал, переведены и используются в школах. А статуя мородунки перед гостиницей в Турове появилась после одной из моих презентаций. Группа белорусских коллег из Минприроды и Березинского заповедника приезжала к нам на обучение в Великобританию. Я очень горжусь тем, что участвую в работе по экопросвещению и развитию экотуризма в вашей стране. Сейчас привожу сюда британских экотуристов, показываю им вашу прекрасную природу.

«ПіМ»: **Почему «природные» туристы готовы ехать к нам за тысячи километров? Чем для них так привлекательна наша страна?**

Б. К.: Беларусь — одно из лучших европейских направлений для наблюдения за дикой природой, потому что у вас сохранились естественные места обитания редких видов птиц и зверей. Их список большой, но самые желанные для европейских туристов — вертлявая камышевка, белая лазоревка, бородатая неясыть, зубр, рысь. Не устаю повторять, что у вас намного больше старого леса и естественных водно-болотных угодий, чем где бы то ни было в Европе.



Белая лазоревка — один из самых желанных видов для иностранных бердвотчеров

ПАВЕЛ ЛЫЧКОВСКИЙ

Барри Купер проработал в сфере охраны природы почти 30 лет. В его послужном списке десятки разработанных программ по связям с общественностью, а также в области экологического просвещения и экотуризма. В последние годы эксперт переключился на полевую работу: сопровождает в качестве гида группы бердвотчеров в различных странах. Ни одна весна не обходится без тура в Беларусь, уже забронированы даты прилета к нам на 2018 и 2019 годы. Свои впечатления от встреч с дикой природой Барри искусно облекает в слова — его статьи публикуются в британских журналах Bird Watching и Bird Watchers Digest.



Думаю, число экологических туристов в вашей стране будет только расти. В последние годы Беларусь активно рекламируется как экотуристическое направление, в том числе у нас. К примеру, я дважды делал презентации вашей страны перед аудиторией из нескольких сотен человек на British Birdwatching Fair. Недавно написал статьи о природном туризме в Беларуси для британского журнала Bird Watching и сайта naturetravelnetwork.com.

Вам нужно охранять уникальные места обитания и виды, которые их населяют, — эта работа имеет международную значимость. А опытом по сохранению вертлявой камышевки и управлению ее местообитанием вы с гордостью можете поделиться с мировым сообществом.

«ПіМ»: **Как вы думаете, в Беларуси бердвотчерское движение когда-нибудь сравнится по размаху, например, с британским?**

Б. К.: АПБ располагает широкой сетью волонтеров, которые вдохновляют людей на наблюдения за природой и бережное отношение к ней, повышают осведомленность о важности птиц и вообще всего живого. Надеюсь, что работа АПБ со школьниками приведет к тому, что многие из них увлекутся бердвотчингом.

«ПіМ»: **А вы сами как увлеклись?**

Б. К.: Я всегда любил природу и с детства наблюдал за птицами. В пятилетнем возрасте заслушивался песней полевого жаворонка, но было очень трудно разглядеть его в небе. Птицы для меня — самый яркий символ живой природы. Что может быть лучше прогулок в «птичьих» местах? А слушать их весенние трели — это, наверно, одно из величайших удовольствий, которые есть у нас в Европе. Еще меня всегда интересовали миграции птиц. Удивительное явление!

«ПіМ»: **В своей статье для Bird Watching вы называете нашу страну исключительной. Какие у вас здесь любимые места?**

Б. К.: Очень люблю Туров — отличное место для бердвотчинга и наблюдения за природой в целом. Нравится Беловежская пуща и Березинский биосферный заповедник. Минск — красивый город, в котором к тому же можно «бонусом» увидеть соловья!

Из исторических памятников на меня неизгладимое впечатление произвела Хатынь. Пожалуй, это одно из самых запоминающихся мест, которые я посещал.

«ПіМ»: **Как человек, побывавших в разных уголках нашей страны, что можете сказать про туристическую инфраструктуру?**

Б. К.: С момента первого приезда я заметил, что количество отелей и ресторанов в Турове растет. Но в других частях страны, где тоже есть прекрасные возможности для экотуризма, нет достойных гостиниц. Так что для развития экотуризма вам нужно больше отелей и мест, где можно поесть. И, конечно, гидов.

«ПіМ»: **За столько лет в Беларуси у вас наверняка случались какие-то выдающиеся встречи с миром природы.**

Б. К.: Да, в 2014 году в Беловежской пуще. Кто-то из группы заметил в поле лису в 200 или 300 м от нас. Я посмотрел в бинокль и чуть не закричал от восторга: это была рысь! Она просидела на месте целых 15 минут — невероятная удача!

«ПіМ»: **Что вы думаете по поводу отношения современного человека к природе и что каждый из нас может сделать для ее сохранения?**

Б. К.: К сожалению, во многих странах люди все больше отрываются от природы. А ее трудно любить, когда нет опыта взаимодействия с ней. Поэтому во все, что связано с окружающей средой, нужно вовлекать как можно больше людей, регулярно проводить занятия со школьниками вне класса, развивать у них любовь ко всему живому. Каждый из нас может сделать свой вклад, руководствуясь в жизни принципами экологической ответственности и поддерживая такие организации, как АПБ.

«ПіМ»: **Вы давно дружите с АПБ. Как оцениваете ее деятельность?**

Б. К.: Я очень уважаю АПБ и всегда положительно отзываюсь о ней в презентациях и статьях. Один из ключевых факторов успеха АПБ — это хорошо налаженные отношения с госорганами, другие НГО могли бы перенять этот опыт. Еще один важнейший элемент — это прекрасные сотрудники и волонтеры, которые работают в организации много лет. Надеюсь, АПБ и дальше будет такой же мощной силой в охране природы. 

Барри Купер — автор концепции визит-центров в Березинском биосферном заповеднике и заказнике «Ельня». В последнем именно он выбрал место для экотропы «Озеравки».

Смотрим птиц по маршруту Барри Купера

Маршрут охватывает юг страны и проходит по самым разнообразным ландшафтам, в том числе реликтовому лесу, заливным лугам, поймам рек, верховым и низинным болотам.



ВИКТОР МАЛЫЩИЦ (фото Припяти)

АЛЕКСАНДР ПЕКАЧ, АЛЛА ЭРДМАН, СЕРГЕЙ ЗУЕНОК, ПАВЕЛ ПИНЧУК, ПАВЕЛ ЛЫЧКОВСКИЙ, ИЛЬЯ УКОЛОВ, НИКОЛАЙ ВОРОБЕЙ, BARRIE COOPER, ASTRID KANT, ORN OSKARSSON, KINAN ECHTAY, STANISLAV DUBEN

Бёрдуотч як хобі на ўсё жыццё



Балотны лунь

МІКАЛАЙ ВАРАБЕЙ



Бёрдуотч, ці назіранні за птушкамі, паступова, але няўхільна набірае ўсё большую колькасць прыхільнікаў у нашай краіне. Так сталася, што я маю да гэтага цікавага руху непасрэднае дачыненне. І калі ўзяўся ўспамінаць, з чаго ўсё пачалося і як развівалася, атрымалася вось такая гісторыя.

ДЗЬМІТРЫ ВІНЧЭЎСКІ

«З «Фотоснайперам» і ў маскхалаце мяне адвезлі ў КДБ»

Калі мне было 11 гадоў, я прачытаў цудоўную кнігу. Выдатным і зразумелым быў не толькі тэкст — хацелася падоўгу разглядаць і радавацца кожнаму малюнку. Такая камбінацыя ўражвае, тым больш у падлеткавым узросце. Кніга называлася «Хищные птицы леса», а з яе аўтарамі — арнітолагам, прафесарам Уладзімірам Галушыным і мастаком-анімалістам Вадзімам Гарбатавым — я пазнаёміўся асабіста ўжо ў дарослым жыцці. А тады праз нейкі час маё жаданне вывучаць птушак паступова забылася.

Аднак птушкі не адпускалі мяне далёка і надоўга. Старэйшы брат Аляксандр выбраў «маю» мару і паступіў вучыцца на біёлага ў БДУ, адкуль праз нейкі час прывёз мне на ўтрыманне самку сокала-кабца без кісці (зламаную, яе ампутавалі). Я назваў птушку Малышка. Яна ўжо ніколі не змагла лятаць, але ва ўсім іншым была сапраўдным сокалам: я амаль штодня ставіў для яе «давілкі» і прыносіў з лесу мышэй і палёвак, а аднойчы нават купіў ёй жывое інкубатарскае кураня на базары.

Прыкладна ў гэты ж час бацькі купілі мне знакаміты савецкі «Фотоснайпер», з якім я амаль увесь вольны час спрабаваў падкрадвацца і здымаць птушак і звяроў у пойме Нёмана, дзе было лецішча бацькоў. З-за «Фотоснайпера» (бо з прыкла́дам і ручкай, як у аўтамата) аднойчы мяне (у маскхалаце, зробленым па маёй просьбе мамай, каб бліжэй падкрадвацца да жывёл узімку) схапілі каля стратэгічнага моста для цягнікоў з ядзернымі ракетамі і адвезлі ў гарадское ўпраўленне КДБ. Усё абышлося «лёгкім спало-

хам», нават плёнку, якую абяцалі праявіць, каб праверыць мае здымкі «на сакрэтны мост», яны так і не апрацавалі.

Маленькія «буслікі»

Пасля школы я не змог паступіць на біяфак Маскоўскага ўніверсітэта і пайшоў працаваць на абласны аптэчны склад. І дзякуючы рэкамендацыі дзейных сябраў Усесаюзнага арніталагічнага таварыства (Всесоюзного орнитологического общества — ВОО) Аляксея Цішачкіна і Ігара Бышнёва хутка стаў, напэўна, адзіным грузчыкам — сябрам ВОО на ўвесь СССР.

Фактычна з-за назіранняў птушак я спазніўся на адпраўку на тэрміновую службу ў войска. Ураджаныя вясновай міграцыяй у Бярэзінскім запаведніку (разам з тымі, хто даў мне рэкамендацыю ў арніталагічнае таварыства), мы не змаглі перасячы на УАЗіку вялізарную калюжыну на шляху назад, у Домжарыцы, адкуль я збіраўся вяртацца дахаты, каб ісці ў ваенкамат. Вымушаны пешы маршрут кіламетраў на 20 не даў магчымасці трапіць туды своечасова, і яшчэ некалькі вольных дзён і іншая каманда прызыўнікоў змянілі маё месца службы, а магчыма, і штосьці большае ў жыцці. А потым у Маскве замест звычайных вайсковых значкоў я з удзячнасцю насіў на кіцелі круглы значок з чырвонаваллёвай казаркай — эмблемай ВОО.

Але нават на першых курсах біяфака Гродзенскага ўніверсітэта, куды я паступіў пасля службы, я ўсё яшчэ не лічыў сябе зацікаўленым назіраннем птушак. Больш думаў пра сябе як пра будучага арнітолага, бо пачаў інтэнсіўна займацца вывучэннем балотнага і поплаўнага луня. Было вельмі цікава, і ўсе новыя факты і назіранні прыводзілі да новых здагадак пра магчымыя заканамернасці. І я шчыра не разумеў: навошта траціць каштоўны час на назіранні нейкіх звычайных стрынатак ці малога грычуна па дарозе да нашых лунёў, калі нас чакаюць яшчэ несабраныя выплюйкі ці нават нязнойдзеныя гнёзды драпежнікаў?

Але ў траўні 2004 года адбыўся выпадак, які пераканаў мяне, што назіранне птушак — не менш цікавая, прыемная і нават, магчыма, каштоўная для навукі рэч. І ў гэтым быў «вінаваты» мой сябар Саша Ясевіч, які з цяжкасцю ўгаварыў мяне глянуць на сажалку ля птушкафабрыкі, дзе на нашых вачах скакалі і бегалі 11 мініяцюрных «буслікаў» з доўгімі чырвонымі нагамі. Мы аслупянелі ад такога відовішча, бо не ведалі, што гэта за від! Дома сярод невялікай колькасці каляровых табліц у просценькім вызначальніку вытворчасці ГДР я знайшоў «нашых» птушак, але нямецкі тэкст не дапамог мне зразумець, каго ж мы насамрэч бачылі. А праз чатыры гады пачаў выходзіць беларускі арніталагічны бюлетэнь Subbuteo, для якога я напісаў артыкул пра першае для Беларусі назіранне хадулачнікаў — імі і аказаліся тыя «буслікі» з-пад Гродна.

«Птушкі Еўропы» і іх беларускія назвы

У 1998 годзе вялікая колькасць зацікаўленых у вывучэнні, ахове і назіраннях птушак заснавала АПБ (тады яшчэ «Ахова птушак Беларусі») — для гэтага аб'ядналіся сябры Беларускага арніталагічнага таварыства і Заходне-Беларускага таварыства аховы птушак, створаных на колькі год раней.

Савецкія вызначальнікі, якімі мы карысталіся, больш былі прыстасаваныя для вызначэння мёртвых птушак. Таму, калі ў 1999 годзе дзякуючы дацкай падтрымцы было вырашана стварыць беларускі цэнтр кальцавання птушак, між іншым пастанавілі і перакласці на беларускую мову выдатны на той час польскі палявы вызначальнік «Птушкі Еўропы». І адным з перакладчыкаў пашчасціла стаць мне. Арыгінальныя малюнкі і даволі падрабязнае апісанне дазволілі працрымацца перакладзенай кнізе ў якасці асноўнага вызначальніка некалькі наступных гадоў. Дарэчы, менавіта для гэтага выдання 2000 года былі «створаны» (большасць проста аднаўлена з публікацый 1920-х) арыгінальныя навуковыя беларускія назвы птушак, якія цяпер успрымаюцца як тыя, што «былі заўсёды».

Захад нам дапаможа! І... пастар

Яшчэ праз тры гады стартаваў праект АПБ і Шведскага арніталагічнага таварыства SOF па развіцці рэгіянальных аддзяленняў АПБ. Я стаў каардынатарам з нашага боку, а з другога былі Ленарт і Хокан — два сябры і настаўнікі з найбольш «бёрдуотчарскага» шведскага вострава Эланд. Мы знайшлі параўнальна шмат зацікаўленых у назіраннях птушак па ўсёй краіне і дзякуючы шведскаму досведу і падтрымцы стварылі нешта абсалютна новае для нас, каб развіваць бёрдуотч. У 2005-м з'явіўся «Клуб-200», а таксама Birdrace (гонка за птушкамі) — у нашым варыянце Адкрыты чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі, які сёлета праходзіў ужо 14-ты раз.

Мы двойчы былі на Эландзе. Нашы сябры-шведы рэгулярна атрымлівалі паведамленні



Дзьмітры Вінчэўскі 📷 АЛЕНА ВІНЧЭЎСКАЯ



EuroBirdwatch-2015, Гродна
ДЗЬМІТРЫ ВІНЧЭЎСКІ

ад тамтэйшага «Клуба-300» пра назіранні рэдкіх залётных відаў, і мы ездзілі глядзець іх, калі паспявалі. Паўсюль мы былі не адны — прыязджалі людзі з оптыкай рознага калібру, якія дапамагалі адно аднаму ўбачыць жаданую птушку і падказвалі, дзе яна была раней, калі ёй чамусьці не сядзелася на месцы. Мы былі прыемна ўражаныя.

Але найлепш я запомніў выпадак з адным з сібірскіх драздоў, на якога мы не паспелі пад'ехаць увечары. Сябры-шведы прапанавалі зрабіць гэта назаўтра, з самага ранку, бо месца яго рэгістрацыі было недалёка. Раніцай там ужо быў назіральнік, які паказаў, дзе шукаць птушку, і пасля гэтага ад'ехаў з пачуццём выкананага абавязку. Як жа мы здзівіліся, калі даведаліся, што гэта быў мясцовы пастар!

«Птушкі штодня» і штоночы

Апошнія гады падзеі, звязаныя з назіраннямі птушак, усё паскараюцца і пашыраюць свае межы. Пасля таго як з-за хакерскай атакі амаль год не працаваў сайт АПБ ptushki.org, група бёрдуотчараў, арнітолагаў і праграмістаў вырашыла стварыць сайт birdwatch.by, які пазней атрымаў назву «Птушкі штодня». І з часу яго з'яўлення — з лютага 2009 года — я застаюся яго рэдактарам. За гэты час нашы карыстальнікі размясцілі тысячы навін і назіранняў, дзясяткі тысяч выдатных фотаздымкаў і відэанарысаў, а вакол сайта ўтварылася і расце «кам'юніці» людзей, якія разумеюць і адчуваюць бёрдуотч падобна, расказваюць пра яго іншым і атрымліваюць ад яго вялікае задавальненне. У 2010 годзе мы першымі ў Беларусі наладзілі анлайн-назіранні за жыццём сокала-пустальгі, і за мінулыя 8 гадоў сотні тысяч людзей з Беларусі і амаль са 150 іншых краін упэўніліся, што ў птушак бываюць свае праблемы і паміж дарослымі, і паміж птушанятамі, і паміж бацькамі і дзеткамі. За камічнымі і трагічнымі падзеямі ў сезон гнездавання можна сачыць не адыходзячы ад камп'ютара ці смартфона.

Сёлета дзякуючы птушкам (і фэйсбуку) я закахаўся ў дзяўчыну з Масквы. Спачатку яна прыцягнула маю ўвагу нечакана шчырымі каментарамі і зацікаўленасцю назіраннямі і здымкамі птушак. Потым мы пачалі перапісвацца амаль ночы напралёт і, калі сустрэліся асабіста, аказалася, што Святлана прыйшла да бёрдуотча праз незвычайную для Масквы сустрэчу з барадатай кугакаўкай у парку Кускова ўзімку. Сава падпусціла яе вельмі блізка, і зробленыя «мыльніцай» фотаздымкі трапілі на прэстыжную анімалістычную фотавыставу пасля настойлівых угавораў маскоўскіх фатографаў. Так і пачалося яе больш шчыльнае знаёмства, а потым і захапленне птушкамі. І падчас нашых прагулак па маскоўскіх лесапарках мы ўжо разам сачылі за жыццём драздоў і сінічак, мясцовых качак-огараў і слухалі начныя спевы садовай чаротаўкі.

Так што той, хто ўжо прыйшоў да птушак, можа разлічваць не толькі на падтрымку і разуменне з боку калег па хобі, але і на нечаканыя змены ў асабістым жыцці. І ўсё самае цікавае, я ўпэўнены, яшчэ наперадзе.



За что мы любим бердвотчинг?



Людмила Корюкина:
Я люблю бердвотчинг, потому что птицы — везде. Даже по дороге на работу можно кого-нибудь увидеть. Я изначально авиаспоттер, а бердвотчингом занялась потому, что птицы тоже летают, но без заборов и служб авиационной безопасности, и, чтобы их увидеть, не нужно ехать в аэропорт.




Ксения Панютич:
Бердвотчинг — это, в первую очередь, радость открытий. Я сама не ожидала, когда пришла в школу бердвотчеров, что наблюдения за птицами настолько затянут. Но в уже привычном темпе жизни что-то вдруг меняется: ты начинаешь шире смотреть на мир и замечать его нюансы. Какое мне раньше было дело до того, что в городе живет не один вид воробьев, а два? Или какая разница, как курлыкает кольчатая горлица? Да и вообще: горлица? В городе? Кто это? А сейчас пройти мимо стайки птиц и не попробовать определить, кто из них кто, — это нонсенс. Услышать чью-то трель и не попытаться выяснить, что за птица пела, невозможно. Потом возникает цепочка вопросов: почему эта птица именно в таком оперении, почему зимует или не зимует у нас, что ей лучше положить в кормушку, как выглядят ее птенцы, какие у нее враги? Начинаешь искать информацию, понимать взаимосвязи в природе, учишься не навредить. Это новые знакомства и «птичьи» поездки, а для друзей ты теперь — эксперт по птицам, что, безусловно, приятно.



Андрей Юлдашев:
Для меня бердвотчинг, конкретнее, фотобердинг — это этичный вариант охоты, при которой птицы не страдают.



11 167 відаў птушак на планеце*



У Беларусі — 329 відаў**



230 гняздуючых відаў




131 зімуючы від



70 відаў у Чырвонай кнізе

Самыя рэдкія нашы птушкі




Чырвоны каршун
1 пара



Сіпуха
1 пара

Самыя шматлікія віды ў Беларусі



Берасцянка
7,5—8,5 млн пар



Палявы жаўрук
2,3—3 млн пар

Найбольш звычайныя птушкі ля кармушкі:

дамавы і палявы верабей,
вялікая і сіняя сініца,
зелянушка,
папаўзень,
шызы голуб



* па дадзеных BirdLife International
** афіцыйны спіс, зацверджаны Беларускай арнітафаўністычнай камісіяй

Сустрэчы, якія змяняюць жыццё

АПЫТВАЛА ДАР'Я ШУПЕНЬКА

Ведаеце, што самае ўражальнае ў сустрэчах з птушкамі? Калі сваім уласным жыццём так ці інакш сутыкаешся з іх уласным жыццём. У кожнага свае патрэбы, а тут раптам для нечага сустрэліся. Людзі зайздросцяць тым птушкам, што лётаюць вольна і далёка, недзе пад нябёсамі. Але ж тут, на зямлі, яны слабыя. Ім неабходны чалавечая дапамога і ахова. Вось некалькі кранальных гісторый пра сустрэчу з птушкай пад вядомымі на Беларусі подпісамі.



Васіль Зуёнак, паэт:

Першая сустрэча з птушкай? Іх было шмат, безліч, можна сказаць. І кожная — першая і нечаканая. Бо і птушка па тым часе была другая, і ты ўжо іншы. А таму ці не прыгадаць вось гэту — «выбуховую», у самы мірны лясны птушына-звярыны дзень?

Прабіраемся паціху з малым сынам між разгалістых сасонак па верасе: мне — па калені, малому — па макаўку. Сапраўды: цішыня і нават нейкая бязважкасць, як у касмічнай прасторы. І раптам — выбух! Спалох ад нечаканасці ў мяне быў звычайны, а ў малога, пэўна, касмічны. Гэта «выбухнула» з гнязда цяцерка. Колькі яна таілася, колькі бедная за гэтыя некалькі хвілін, а то і секунд, нацярпелася страху. І ўсё ж вымушана была ратавацца з-пад няўмольнага наступу чалавечай нагі.

І цяпер пра самае ўражальнае (і пачувальнае!) для чалавека: птушка да свайго наседжанага гнязда не вярнулася. Яйкі засталіся ляжаць халоднымі.

Будзь асцярожным і абярэжлівым, чалавек, імянуючы сябе «царом прыроды»!

Алена Адамчык, фатограф, аўтар праекта «Беларускі — жанчыны Еўропы»:



Вельмі люблю птушак, кармлю іх, шкадую. Яны зімой да мяне прылятаюць і стукаюць у шыбы. Сустрэч з імі было шмат. Бывалі і горкія: цяжка глядзець на збітых птушак на дарозе...

Аднойчы ехала я на машыне, убачыла каля дарогі юнака і дзяўчыну з роварамі ў руках, нешта там у пяску разглядалі яны. Я зразумела, што там птушка і што яна яшчэ жывая, але падумала, што гэтыя двое яе падымуць. Потым азірнулася, бачу — яны селі на ровары і паехалі. Паварочваю машыну, іду да птушкі. У пяску бачу вялікае птушаня коўры, ледзь-ледзь жывое. Я яго схапіла, павезла хутчэй да вады — блізка было да Мінскага мора. Усё дзівілася, як яно да дарогі трапіла! Паганкі вельмі клапатлівыя, сваіх дзяцей нават на спіне вырошчваюць, а тут птушаня ў пяску каля аўтамабільнай дарогі... Прынесла малое туды, дзе паганкі звычайна вадзіліся, і паклала на ваду каля чароту. Крыху папырскала на яго, і, як ад жывой вады, птушаня адразу пачало неяк боўтацца, ажыло, хуценька паплыло ў густы чарот. Выратавала. Бо люблю іх. Як іх не любіць?



Светлана Боровская, телеведущая:

На дачном участке у меня много разносортных кустов жасмина и каждый год, причем довольно низко, в них селятся птицы. Подошла я как-то к своему жасмину — и из него выпорхнула птичка. Я с любопытством, очень осторожно расправила ветки, глянула и испугалась — внутри куста осталось удивительной красоты скрученное гнездышко и четыре пестрых яйца в нем. Волновалась жутко: только бы их мамочка вернулась. С того дня я стала сторожем гнезда. Никого к жасмину близко не подпускала, отгоняла от него местных котов и кошек. Объяснила детям, что нельзя дотрагиваться до этого кусточка, иначе птичка учует и больше не вернется. И могу вам сказать, что у меня ни один птенец не погиб! Мы с птичкой их дорастили, а потом ее птенчики выросли и улетели.

Я не знаю, какого именно вида эти птицы, и не знаю причин, по которым они вьют гнезда именно в этом месте. В общем, не так образованна в этих вопросах, как орнитологи. Но с большим трепетом отношусь к птицам, охраняю их как могу. Что-то в них есть такое — небесное, правильное. То, чего люди не могут. Ведь почему-то же люди не летают.


Северные гости

Бердвотчинг хорош тем, что заниматься им можно в любое время года, даже зимой. В холодный сезон в Беларуси встречается около 120 видов птиц, то есть больше трети всех зарегистрированных. В одном Минске «зимний» список пернатых включает 50–60 видов. Изюминка зимнего бердвотчинга в том, что помимо «своих» птиц можно наблюдать крылатых гостей с севера, которых летом в Беларуси не увидишь.




Свиристель

Если вы заметили на деревьях стаю от 20 до 100 хохлатых птиц размером со скворца, то это они. Свиристели издают характерные «свиристящие» звуки. В населенных пунктах совершают «налеты» на кусты рябины и можжевельника. Хорошенько проредив урожай в северных районах Беларуси, смещаются южнее, где охотно едят ягоды омелы («амялушка» — так звучит название вида по-белорусски).



Обыкновенная чечетка
(также могут встретиться горная и пепельная)



Лапландский подорожник



Пуночка



Рогатый жаворонок

Если чечеток можно увидеть и на полях, и в населенных пунктах, где они не прочь полакомиться семенами березы и сорняков, то остальные, скорее, птицы «загородные». Эти северные гости придерживаются полей и обочин дорог, где остались не заметенные снегом сорные растения, семена которых и есть предмет их интереса.

Зимняк, или мохноногий канюк



Для нас это обычный зимующий вид. Обращайте внимание на провода, столбы, деревья у полей и лугов: зимняк часто караулит добычу, как говорится, «на посту». А может зависать в воздухе, выглядывая грызунов. Обратите внимание на его отличия от обыкновенного канюка, который сейчас также зимует у нас.

Оляпка



Зимой это птица незамерзающих мелководных речек с каменистым дном. Ее наблюдали возле Гродно, вблизи Минска — на Свислочи и на Птичи, у Лепеля. В связи с потеплением климата оляпки не встречаются у нас в последние годы, но могут появиться, если более северные речки замерзнут.

Ястребиная сова



«Ястребинку» регистрировали в Шарковщинском, Россонском и Браславском районах. Предугадать появление этой совы сложно, но с большей долей вероятности птицу можно увидеть на окраинах населенных пунктов, рядом с которыми есть поля — места ее охоты.

Полярная сова



Увидеть полярную сову вероятнее всего на верховых болотах, которые по ландшафту схожи с местом ее обитания — тундрой. Документированных встреч с ней в Беларуси не так много. Но «большую белую сову» легко определить, и надеемся, что вам повезет.

НИКОЛАЙ ВОРОБЕЙ, ПАВЕЛ АЛЕКСЕЕВ, АННА ГОЛУБЕВА, TIM ZUROWSKI, TOM REICHNER, ANIMALBOX.RU, RBCU.RU, FLICKR

Остаемся зимовать

Со времен Саврасова и его «Грачей» из перелетных в оседлые в наших широтах перешли не только эти представители врановых, но и некоторые другие птицы. Зимовать в Беларуси все чаще остаются белый аист, серый журавль, различные насекомоядные виды. Почему бывшие «мигранты» становятся «патриотами» и не улетают на юг?

Семен Левый, специалист АПБ по природоохранным вопросам:

Такое поведение нередко связывают с потеплением климата, хотя для зимующих видов важна не только и не столько теплая погода, сколько наличие корма. Если птице достаточно еды, чтобы вырабатывать энергию для обогрева, то она может не улетать практически весь год. Сложнее всего в холода тем видам, которые привыкли питаться насекомыми и амфибиями, но и они находят способы выживать.

Белые аисты приспособились искать корм на незамерзающих водоемах. Кроме того, они получают подкормку от людей. К примеру, одна птица уже который год зимует в минском микрорайоне Шабаны.

Насекомоядные: крапивник, белая трясогузка, пеночка-теньковка — в холодный сезон также перемещаются из своих мест обитания ближе к незамерзающим водоемам, где можно найти насекомых и пауков. Кстати, в Беларуси есть даже единичные зимние регистрации горихвостки-чернушки, лугового конька и ремеза.

А вот на серого журавля влияние оказывает как раз изменение климата. Для него критический фактор — наличие и толщина снежного покрова, поскольку птица питается зимой растительным кормом. Малоснежные зимы позволяют ей прокормиться на участках, где нет снега. Пока на зимовку остаются единичные особи, но тенденция уже просматривается: в Беларуси серых журавлей наблюдают в холодное время 3–4 последних года.



Серый журавль



GRUSGRUS444

Красноухая овсянка



Птицы на снегу



ЕЕ ИМПЕРАТОРСКОЕ ВЫСОЧЕСТВО
ПРИНЦЕССА ЯПОНИИ ТАКАМАДО, ПОЧЕТНЫЙ
ПРЕЗИДЕНТ BIRDLIFE INTERNATIONAL

Я всегда радуюсь первому снегу, особенно если он не тает сразу после того, как выпал. Возможно, потому что с ним оживают детские воспоминания. Нам нравилось кататься по рыхлому снегу, не сильно вымокая. Мы строили крепости и горки, лепили снеговиков. Для детей он — идеальная игровая площадка, где можно дать волю фантазии или просто бегать и бросаться снежками. Вода проливается на землю в виде различных осадков, но никакие из них не вызывают такого восторга, как снег.

По материалам журнала Fujingaho. Перевод: Ростислав Голод, волонтер АПБ


HIROSHI NAKAMURA


Японская белоглазка

Самое сложное в зимних наблюдениях за птицами — заставить себя выбраться утром из постели. Дома я часто не могу устоять перед искушением завернуться в одеяло и еще немного поспать. В поездках же, как ни странно, встаю почти сразу, как бы холодно и снежно ни было за окном. Дождь или мокрый снег не лучшие условия для съемки: может испортиться фотоаппарат. Зато небольшая метель не помеха. Во время снегопада получаются динамичные снимки, а тонкий снежный ковер поверх опавших листьев и голой земли только украсит картинку.

Снимки этих птиц сделаны в префектуре Нагано после обильного снегопада. Овсянку-ремеза бывает трудно отличить от красноухой овсянки, когда они скачут по веткам или по земле. Совсем другое дело на белом фоне. Однако зимой не только птицы становятся виднее — мы тоже заметнее для них. Чтобы сделать эти фотографии, мне пришлось два дня с утра до вечера прятаться в палатке.

Овсянка-ремез чистила перья и, услышав щелчок затвора, посмотрела в сторону объектива. Поняв, что этот звук издал не человек, она продолжила свое занятие. Птицы и звери привыкли быть всегда начеку, ведь им постоянно угрожает опасность. Задача фотографа — ничем себя не выдать, иначе они мигом заподозрят неладное. Всегда забавно померяться смекалкой с птицей и зачарованно наблюдать за ней через объектив камеры: кто кого?

По моим ощущениям, зимой маленькие птицы активны не только рано утром, но и днем. Думаю, потому что в это время года им сложно отыскивать корм. Их многочисленные следы на снегу говорят о суровой битве со смертью в поисках пищи, а не о том, как им весело прыгать и играть. Птицы, которых я сняла в этот раз, — прилежные труженики, сумевшие выжить после аномальных снегопадов.

Мы все чаще слышим выражение «аномальная погода», а это означает, что природные катаклизмы становятся нормой. Может, поэтому в последнее время меня то и дело посещают милые сердцу воспоминания о тех днях, когда поры года плавно сменяли друг друга.

Овсянка-ремез

Масаі Мара — краіна з кніжак дзяцінства

Нягледзячы на мой даволі багаты падарожніцкі досвед, у Афрыку, калі не браць у разлік самай паўночнай яе часткі ў наваколлі Каіра, я трапіў упершыню. Не трэба тлумачыць, што любая новая мясціна выклікае ў душы сапраўднага натураліста цэлую гаму пачуццяў, але ж гэта была проста бомба!

СЯРГЕЙ ЗУЁНАК

450 відаў птушак і найбуйнейшая папуляцыя леапардаў

Першы час я ўсё ніяк не мог пазбавіцца ад пачуцця нерэальнасці падзей, якія, быццам у паскораным кіно, праносіліся перад маімі вачыма. Насамрэч, такой колькасці новых відаў звяроў і птушак, што мне пашчасціла назіраць літаральна ў першы дзень свайго знаходжання ва Усходняй Афрыцы, я не бачыў за апошнія дзесяць, а можа, нават і болей, гадоў свайго жыцця. І толькі праз пару дзён, калі крыху адпусціў першы адрэналін, а штовячэрні прагляд карткі памяці фотакамеры бясспрэчна пацвярджаў, што ўсё было рэальна і менавіта ў дзікай прыродзе, я пачаў пакрысе пераконвацца ў тым, што гэтыя краявіды, звяры, птушкі і экзатычныя людзі жывуць не толькі на старонках любімых з дзяцінства кніжак і на канале NG Wild, але і на самай справе, на адной з намі Зямлі, і пабачыць іх «ужывую» — не такая ўжо і праблема, варта толькі вельмі захацець.

Штосьці каля двух сутак дарогі, і вось яно, знаёмства з сапраўднай дзікай Афрыкай, знаходжанне па той бок экватара — у якасці прыемнага бонуса, і таксама ўпершыню. Нацыянальны парк (ён жа і ТВП) Масаі Мара, які з'яўляўся асноўнай мэтай нашай паездкі, утвораны ў паўднёва-заходняй частцы Кеніі каля танзанійскай мяжы на самым краі Вялікага афрыканскага разлому і мае плошчу больш за паўтары тысячы квадратных кіламетраў (гэта амаль у два разы больш за Бярэзінскі біясферны запаведнік). Паколькі парк знаходзіцца на даволі значнай вышыні — каля 1800 м над узроўнем мора, то, нягледзячы на «амаль што экватар», клімат тут у сухі перыяд даволі камфортны і нагадвае наша беларускае лета — памерана цёплыя дні, золкія ночы. Большую частку тэрыторыі займаюць парослыя рэдкімі акацыямі і хмызняком саванны, але ёсць і забалочаныя мясціны, вельмі прывабныя для жывёл, асабліва ў сухі перыяд. Акрамя львоў, жырафаў, сланоў, гіпапатамаў, буйвалаў і «джэнтльменскага набору» антылоп, якія сустракаюцца тут літаральна на кожным кроку, парк дае прытулак больш чым 450 відам птушак, а фірмовай фішкай Масаі Мара можна лічыць гепардаў і чорных насарогаў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення, а таксама найбуйнейшую ў свеце

Узыход сонца ў афрыканскай саванне — сапраўдны спектакль, у якім дэкарацыі і дзеючыя асобы змяняюцца кожную хвіліну

папуляцыю леапарда. Аматары назіранняў за жывёламі маюць тут усе падставы толькі за першы дзень дадаць у свае Seenlist-ы пад 20 відаў млекакормячых і тры-чатыры дзясяткі відаў птушак, гэта ўжо як пашанцуе.

Зямлю — масаям

Калі быць больш дакладным, дык юрыдычна Масаі Мара не зусім нацыянальны парк у нашым звыклым разуменні, паколькі ўся зямля тут належыць масаям — легендарнаму афрыканскаму народу ваяўнікоў, які і ў нашы дні працягвае жыць па сваіх уласных законах і традыцыях. Зямля — масайская, а вось усё, што там жыве і расце, належыць дзяржаве. Такі вось афрыканскі парадокс, які, аднак, зусім не перашкаджае падтрымліваць ахову гэтай тэрыторыі на вельмі высокім узроўні. Дарэчы, за падтрыманнем парадку тут сочаць не толькі добра ўзброеныя федэральныя рэйнджары, але і ўладары «зямельнага фонду» — масаі, і ні з тымі, ні з другімі, паверце, не пажартуеш.

Масаі Мара з'яўляецца працягам двух значна буйнейшых сусветна вядомых нацыянальных паркаў Нгора-Нгора і Серэнгеці, што знаходзяцца ўжо ў Танзаніі, на дне рыфтавай даліны. Разам яны ўтвараюць вялізную тэрыторыю,



Як і вынікае з назвы, малая пчалаедка — самы дробны прадстаўнік роду, памерамі яна не большая за нашу берасцянку

на якой захоўваецца значная частка афрыканскай біяразнастайнасці. Працягласць гэтай тэрыторыі ў шыротным накірунку дае траваеднаму насельніцтву паркаў магчымасць амаль круглы год харчавацца параўнальна свежай зелянінай. Штогод у другой палове лета, калі рэшткі недаедзенай травы на поўдні канчаткова выгараюць, дзясяткі тысяч антылоп гну і іншых капытных у пошуках ежы пачынаюць вялікую міграцыю на поўнач, у Масаі Мара, дзе праводзяць некалькі месяцаў, перш чым рушыць назад, у даліну, на зноў зазелянелыя пасля дажджоў пашы.



Чорнагаловыя ткачы гняздуюцца каланіяльна, але кожная пара будуе асобнае гняздо, размяшчаючы яго на павіслай галінцы дрэва альбо куста

Big Five па-афрыканску

Зразумела, што прысутнічаюць у парку і элементы турыстычнай інфраструктуры ў выглядзе шматлікіх дарог, з'язджаць з якіх, як і выходзіць з машын, строга забаронена. Ну, а ў іншым амаль некранутая саванна жыве па сваіх спрадвечных законах і, за рэдкім выключэннем, абсалютна не звяртае ўвагі на дзівакоў, што «коўзаюцца» па гэтых дарогах на джыпах з біноклямі і фотакамерамі. Называецца гэта забава гучным словам «сафары», і менавіта яна збірае ва Усходняй Афрыцы аматараў прыроды з усяго свету. Трэба адзначыць, што падтрыманне ахоўнага рэжыму на такім узроўні стала магчымым тут у значнай меры дзякуючы гэтым аматарам, а дакладней, сродкам, якія яны пакідаюць у казне парку за аказанне турыстычных паслуг. Але ёсць ва ўсім гэтым і зваротны бок — некаторыя даследчыкі лічаць, што праблемы мясцовай папуляцыі гепардаў звязаны непасрэдна з турыстычным прэсінгам, які перашкаджае ім пасяховa паляваць у светлы час сутак — у адрозненне ад ільвоў і леапардаў гэтыя драпежнікі здабываюць ежу менавіта ўдзень.

«Сафары» ў перакладзе з суахілі азначае не што іншае, як «прагулка», і ніякага дачынення да палявання не мае. Гэта ўжо потым у інтэрпрэтацыі еўрапейскіх «даследчыкаў» Афрыкі яно набыло агульнавядомы памылковы сэнс гонак за звярамі на джыпе са стрэльбамі наперавес. Дзякуй Богу, такія «даследаванні» ў Кеніі даўно і начыста забаронены, так што ўсе сафары носяць тут выключна міралюбівы характар.





Далёкі сваяк нашых варон вілахвосты дронга навучыўся па-майстэрску імітаваць трывожныя крыкі розных звяроў і птушак, што з поспехам выкарыстоўвае для таго, каб скрасці ў іх здабычу




Чарнагруды арол-вужаед, які сваімі звычкамі і паводзінамі нагадвае еўрапейскіх вужаедаў, шырока распаўсюджаны ў саваннах Паўднёвай і Усходняй Афрыкі

Дарэчы, сусветна вядомы спіс афрыканскага Big Five (слон, насарог, буйвал, леў і леапард) таксама прыдумалі паляўнічыя — менавіта гэтых звяроў неабходна было здабыць для таго, каб усе лічылі цябе сапраўдным героем. Карыстаючыся выпадкам, пахвалюся, што гэты спіс закрыў (у бяскроўнай, зразумела, інтэрпрэтацыі) для сябе і я, і не толькі закрыў, але і пашырыў, дадаўшы ў лік сваіх фотатрафеяў яшчэ некалькіх буйных прадстаўнікоў афрыканскай фаўны, якія чамусьці, на мой погляд, зусім незаслужана не ўвайшлі ў склад знакамітай «пяцёркі».

«Калі вамі не зацікавіцца леў, то проста стопчуць сланы»

У многім поспехі нашай прагулкі былі абумоўлены майстэрствам нашага гіда, знаўцы мясцовай фаўны і флоры і кіроўцы сафары-джыпа, цемнаскурага дабрадушнага здаравяка Патрыка, «былога ваеннага», як ён сам сябе прадставіў. Шмат цікавага даведаліся мы ад яго і пра жыццё мясцовых звяроў — ад складаных узаемаадносін у львіным прайдзе да праблем кровазвароту жыраф. Дасканалае веданне Патрыкам мясцовасці і звычак тутэйшых жывёл значна палягчала нам іх пошукі, дакладней, ён ехаў куды трэба, а мы ў шэсць пар вачэй уважліва азіралі наваколле. Дапамагала ў гэтай справе і салідарнасць мясцовых гідаў — як толькі камусьці з іншых экіпажаў удавалася ўбачыць нешта цікавае, ён паведамляў пра гэта па рацыі сваім калегам. Менавіта дзякуючы такому «саваннаму радыё» нам пашчасціла адшукаць леапарда — параўнаўча шматлікага, але самага непрыкметнага драпежніка гэтых мясцін. Праўда, да фотасесіі ён быў абсалютна не падрыхтаваны (пэўна, выключыў сваю рацыю, перш чым завалiцца спаць у хмызняках пасля паспяховага палявання). Але ўсё ж гэта быў сапраўдны дзікі леапард, адзін з членаў «вялікай пяцёркі», між іншым!

З надыходам цемры, а дакладней, да 19 гадзін, усе машыны мусяць пакінуць тэрыторыю



Як і большасць антылоп, імпалы вядуць гарэмны лад жыцця. Усе чужыя самцы-спакуснікі, якія парушылі тэрыторыю гарэма, бязлітасна выганяюцца гаспадаром



Чырванагорлы франкалін —
своеасаблівы афрыканскі фазан



Бананаед мае звычку пры любой небяспецы ўсчынаць гучны лямант, менавіта за гэта ён і атрымаў сваю англійскую назву — Go Away («ідзі прэч»)

парку — настае час драпежнікаў. На наша пытанне, а што калі прагуляцца ноччу па саванне, Патрык вельмі сур'ёзна адказаў: «Кіламетраў пяць, можа, і пройдзеце, а вось дзесяць — дакладна не, такое пад сілу толькі масаям. Калі вамі не зацікавіцца леў, то проста стопчуць сланы альбо буйвалы. Патрывожаныя падчас начнога адпачынку, яны ў цемры проста змятаюць усё на сваім шляху».

Hakuna Matata

Вельмі душэўна і па-свойску выглядае кемпінг, у які бліжэй да вечара падцягваюцца ўсе тыя, хто, пераадолеўшы тысячы кіламетраў, сабраўся тут з розных канцоў свету, каб пазнаёміцца альбо працягнуць сваё знаёмства з дзікай Афрыкай. Апартаменты — брэзентавая армейская палатка на бетонным фундаменце, уваход у якую трэба шчыльна закрываць, каб малпы не нарабілі шкоды ў адсутнасць гаспадароў; рэстаран, ён жа і паб, — простая драўляная пабудова, дзе можна запраста падысці да любога, пацікавіцца, хто ён, адкуль і што яму ўдалося ўбачыць альбо сфатаграфаваць на працягу дня. У самай глыбіні «паба» каля століка з адзінай на ўвесь лагер электрычнай разеткай, дзе можна зарадзіць падселыя за дзень батарэі камер і тэлефонаў, Патрык на пару з рускай дзяўчынай ціхенька напявае на суахілі папулярную ў гэтых мясцінах песеньку: Wageni, Wakaribishwa, Kenya yetu Hakuna Matata — «завітайце ў нашу Кенію, няма праблем». І ўсё гэта абнесена агароджай, перыметр якой кантралююць вартаўнікі-масаі ў каларытных адзеннях. Афрыка!

Аднаго крыху шкада — так і не ўдалося разгледзець на зорным небе Паўднёвы Крыж, альбо South, як яго тут называюць. Няўлоўны ён нейкі — то хмары на небе, то дрэвы перакрываюць тую частку далягляду, дзе ён мусіць быць. Дый пры чыстым небе паспрабуй адшукай яго, непрыкметнага, сярод тысяч іншых незнаёмых зорак. Але не бяда, магчымасць рэабілітавацца яшчэ будзе. Афрыка чапляе і зацягвае, Hakuna Matata!




Большую частку жыцця птушка-сакратар праводзіць на зямлі, вышукваючы ў высокай траве змей, яшчарак і іншую драбязу. А вось гнёзды, як і большасць драпежных птушак, яна ўладкоўвае на дрэвах



О птицах прошлого и будущего

Игорь СКОРЫНИН,
ветеран белорусского бизнеса,
бывший минчанин, живущий в лесу



Я не верю в эволюцию.

То есть я верю, что мир менялся, но я не верю, что он менялся сам по себе, из ниоткуда в никуда, случайно, и вдруг из космической пыли превратился в березовую рощу, где ранним апрельским утром свистят дрозды, и в заросли ивы на берегу ручья, откуда теплым майским вечером на всю округу слышен соловей.

Их кто-то заранее придумал, хулигана-дрозда и романтика-соловья.

Но я верю в грехопадение.

Я верю, что когда-то человек, бывший частью идеального мира, пошел своим, неправильным путем и этим разрушил совершенство.

Я думаю так потому, что живу в лесу.

Начиная с середины марта лес постепенно оживает, становясь с каждой неделей все громче и радостней.

И превращается в филиал рая.

Я всегда очень радуюсь.

Но, к сожалению, я знаю, что будет дальше.

Ранним солнечным апрельским утром, просыпаясь, я услышу звук, который ненавижу и которого боюсь. Это будет негромкий глухой удар в стекло.

И я подумаю: «Нет!..»

И выйду на улицу.

И там под окном будет лежать мертвая птичка. Поджатыми лапками кверху, с безропотно сложенными крыльями и с повернутой набок головкой. Может, это будет большой дрозд с пятнышками на груди, а может, зарянка, а может, скворец. И мне в очередной раз станет безумно жаль, и я испытаю стыд за то, что я пришел в их лес, построил тут свой дом с коварными стеклянными окнами, в которых отражаются деревья, и теперь радостные птички, у которых было все лето впереди, ударяются о мои окна и погибают.

Однажды в незнакомом доме я с размаху стукнулся лбом в бронированное стекло. Я его не заметил на просвет. Было очень больно.

И я наклеиваю на свои окна картинки страшных орлов и коршунов, чтобы сделать стекла заметнее и отпугнуть от них своих доверчивых соседей. Это помогает, но только отчасти.

Однажды в незнакомом доме я с размаху стукнулся лбом в бронированное стекло. Я его не заметил на просвет. Было очень больно. И я наклеиваю на свои окна картинки страшных орлов и коршунов, чтобы сделать стекла заметнее и отпугнуть от них своих доверчивых соседей.

Просто мне с моими стеклами в раю не место.

Я из другого мира.

К сожалению.

Я часто летаю во сне. Разгоняюсь, чуть налегаю на крылья, еще недавно бывшие руками, и уверенно взлетаю. Набираю высоту, но не как самолет, а как птица. Ловлю потоки воздуха, наслаждаюсь его упругостью под крылом и чувствую себя легко и свободно.

Это прекрасное чувство.

А потом просыпаюсь — разочарованный. Вспоминаю свой сон и понимаю, что в жизни я не летаю не потому, что у меня нет крыльев.

Нет.

Просто мои заботы так тяжелы и мои грехи так неподъемны, что с ними не взлететь. И я суечусь тут, на земле, хожу, бегаю и езжу на быстрой машине, стремясь решить проблемы и пытаясь очистить сердце. Но вместо старых проблем возникают новые.

Увяз коготок — увязла птичка.

И я думаю, что тогда, до грехопадения, люди летали, как птицы. Я в этом практически уверен. Иначе откуда эти сны?

И потом, в раю, о котором мы мечтаем, мы полетим снова.

И вокруг будет пение птиц, прекрасные цветы и тугой воздух под сильным крылом.

А внизу — леса, сады и реки.

И ни одна — ни одна! — птица никогда не разобьется о стекло.

Канюх-мышалоў і махнаногі канюх: на якія прыметы звяртаць увагу, каб адрозніць?

КАНЮХ-МЫШАЛОЎ
(обыкновенный канюк)



МАХНАНОГІ КАНЮХ
(зимняк)



АПБ выдала вызначальнік птушак у 2017 годзе ў рамках праекта ЕС «Аб'ядноўваемся вакол прыроды»

Больш поўнае апісанне відаў птушак, што сустракаюцца ў Беларусі, глядзіце тут: **http://www.ptushki.org/guide**



Шчыгел

птушка
2018 года



Берасцянкі, зелянушкі і чыжы – найбліжэйшыя родзічы шчыгла сярод беларускіх птушак

Жыве на ўсёй тэрыторыі Беларусі круглы год. Паводле дадзеных кальцавання, некаторыя шчыглы дажываюць да 14 гадоў!

Шчыгел лічыцца адным з найлепшых спевакоў. У ягоных звонкіх песнях спецыялісты вылучаюць больш за 20 варыяцый

Гняздо ў выглядзе акуратнай місачкі з моху, лішайніку і павуціння будуе толькі самка ў кронах дрэваў у садах, парках, на ўзлесках і ў прыдарожных палосах. За красавік-чэрвень пара паспявае ўзгадаваць два вывадкі

Рацыён шчыгла ўзімку складаецца з насення пустазелля, а ўвесну і ўлетку птушкі збіраюць насякомых сабе і птушанятам. Асабліва любяць тлю з маладых парасткаў дрэваў

Самцы і самкі амаль не адрозніваюцца